ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

# Гомельскі універсітэт



| № 2 (903) | СЕРАДА, 7 лютага 1996 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана дагаворная |
|---|---|---|---|---|

## СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

- 1. З савета універсітэта, на якім былі падведзены вынікі мінулага года. Інфармацыя з прафкома.
- 2. Студэнцкая стыпендыя: яе памеры залежаць ад адзнак.
- 3. Для паляпшэння матэрыяльнай базы біялагічнага факультэта.
- 4. Кнігі нашых вучоных. Паэзія.
- 5-6. Вялікія таленты беларускай літаратуры. Аб пісьменніках-юбілярах.
- 7. Пашырым свае веды пра горад-пабрацім.
- 8. Як адпачылі студэнты на канікулах, спартыўныя дасягненні ГДУ, гумар.

Абмеркавана на Савеце

## ГОД БЫЎ ПЛЁННЫМ

25 студзеня г.г. адбылося пашыранае пасяджэнне савета універсітэта. На ім з дакладам аб асноўных напрамках дзейнасці ГДУ за 1995 год выступіў рэктар акадэмік Беларускай нацыянальнай акадэміі адукацыі, член -- карэспандэнт АНБ Л.А.Шамяткоў. Ізлажэнне яго даклада будзе апублікавана ў наступным нумары нашай газеты. Сёння ж мы канстатуем, што мінулы год для нашага універсітэта, як адзначыў дакладчык, быў даволі плённым, нягледзячы на складаныя эканамічныя ўмовы.

На савеце размеркаваны сродкі конкурснага дзяржбюджэтнага фінансавання навукова-даследчых работ на бягучы год. Па гэтаму і некаторых іншых пытаннях парадку дня выступіў прарэктар па навуковай рабоце прафесар А.М.Сердзюкоў.

Зацверджаны змяненні і дапаўненні да вучэбнага плана "Фізічная культура і спорт".

Па конкурсу на вакантныя пасады выбраны прафесарска-выкладчыцкі састаў.

Савет вылучыў доктара тэхнічных навук, прафесара І.М.Мельнічэнку на выбранне членам-карэспандэнтам Беларускай інжынернай тэхналагічнай акадэміі.

## ЧЛЕН-КАРЭСПАНДЭНТ НОВАЙ АКАДЭМІІ

Пасля набыцця Беларуссю суверэннай незалежнасці ў нашай краіне ствараецца сетка навуковых устаноў акадэмічнага тыпу. Адной з нядаўна адкрытых стала Акадэмія навук метралогіі "Белая Русь" пры Белстандарце. На прайшоўшым тут агульным сходзе членам-карэспандэнтам гэтай акадэміі абраны загадчык кафедры метралогіі нашага універсітэта дацэнт М.І.Аляшкевіч.

## ДЛЯ ВАС, АСПІРАНТЫ

Міжнародная Сорасаўская праграма адукацыі ў галіне дакладных навук у Беларусі аб'яўляе конкурс па падпраграме "Сорасаўскія аспіранты".

Дакументы на ўдзел у конкурсе павінны быць высланы да 1 сакавіка 1996 г. па адрасу: 220072, г. Мінск, пр-т Ф.Скарыны, 66, Міжнародная Сорасаўская праграма адукацыі ў галіне дакладных навук (тэл. (0172) 68-57-45).

З узорам анкеты можна азнаёміцца ў навуковым аддзеле ГДУ.

Прафком інфармуе

## АБ ЗМЕНАХ У АПЛАЦЕ І ВЫДАЧЫ ПУЦЁВАК

**З бягучага года ў палажэнні аб парадку выдачы пуцёвак на санаторнае лячэнне і аздараўленне, якія набываюцца за кошт сродкаў дзяржаўнага сацыяльнага страхавання, з"явіліся істотныя змены. Рэдакцыя газеты папрасіла пракаменціраваць іх бухгалтара прафкома ГДУ Т.А.Валчкову:**

-- У першую чаргу гэтыя змены датычаць аплаты кошту пуцёвак, закранулі яны і парадак выдачы пуцёвак для сямейнага адпачынку. Так, калі зарплата работніка універсітэта складае да 10 мінімальных зарплат, то ён аплачвае, як і раней, 10% кошту пуцёўкі. Калі ж яго заробак вышэйшы за гэты паказчык, ён будзе плаціць ужо 15% за пуцёўкі з мая па верасень.

Пуцёўкі, прызначаныя для сямейнага адпачынку, выдаюцца работніку і яго членам сям"і, у тым ліку і не працуючым у ГДУ. Пры адсутнасці такіх пуцёвак могуць быць выдадзены дзве пуцёўкі, у тым ліку і на члена сям"і. Аб выдзяленні пуцёўкі не працуючаму ў нас члену сям"і паведамляецца па месцы яго работы.

Пуцёўкі на санаторнае лячэнне і аздараўленне выдаюцца пасля папярэдняй аплаты іх частковага кошту. Пуцёўкі на санаторна-курортнае лячэнне для маці і дзіцяці, падлеткаў, навучэнцаў сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, студэнтаў ВНУ (навучанне з адрывам ад вытворчасці), у дзіцячыя санаторыі выдаюцца з аплатай 10% іх кошту.

Размер частковай аплаты за пуцёўку ўстанаўліваецца на падставе даведкі аб памеры заработнай платы (даходаў), налічаных работніку за каляндарны месяц, які папярэднічае месяцу, у якім выдаецца пуцёўка, з улікам прэмій, даплат, надбавак.

Бясплатна пуцёўкі могуць выдавацца ўдзельнікам Вялікай Айчыннай вайны, шматдзетным сем"ям, ветэранам -- былым работнікам універсітэта.

Аб памеры стыпендыі

# ХТО ЯК ВУЧЫЦЦА, ТОЙ СТОЛЬКІ І АТРЫМАЕ

Новыя размеры дзяржаўных стыпендый для навучэнскай моладзі ўведзены з 1 студзеня бягучага года. Як паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў прэс-цэнтры Міністэрства адукацыі і навукі рэспублікі, яны зацверджаны сумеснай пастановай Міністэрства фінансаў і Міністэрства працы ў мэтах выканання Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь нумар 474 "Аб сацыяльнай падтрымцы навучэнскай моладзі".

Прынятай пастановай распрацаваны размеры трох відаў стыпендыі: імянных, сацыяльных і навучальных. Згодна з дакументам, самыя вялікія сумы чакаюць імянных стыпендыятаў. Тыя з іх, хто вучыцца ў ВНУ, атрымаюць імянную стыпендыю ў размеры 260-і працэнтаў мінімальнай заработнай платы. Навучэнцам сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў імянная стыпендыя назначана крыху меншая -- 240 працэнтаў мінімальнай зарплаты.

Па-іншаму выглядае намінацыя "навучальныя стыпендыі": у ВНУ -- 160 працэнтаў мінімальнай заработнай платы, у сярэдніх спецыяльных навучальных установах -- 135 працэнтаў.

Для той катэгорыі навучэнцаў, якія рашэннямі ўрада пастаўлены на поўнае дзяржзабеспячэнне, навучальныя стыпендыі складуць у ВНУ -- 80 працэнтаў мінімальнай зарплаты, а ў сярэдніх спецыяльных навучальных установах -- 70 працэнтаў.

Размер сацыяльнай стыпендыі ў ВНУ роўны 120-і працэнтам мінімальнай зарплаты. А ў сярэдніх спецыяльных навучальных установах сацыяльная стыпендыя прыраўнавана да мінімальнай зарплаты. 100 працэнтаў яе будуць атрымліваць і слухачы падрыхтоўчых аддзяленняў ВНУ з ліку дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў. У гэты разрад атрымальнікаў уваходзяць таксама дзеці ваеннаслужачых, загінуўшых пры выкананні інтэрнацыянальнага абавязку, чыё забеспячэнне ўзяла на сябе дзяржава, слухачы падрыхтоўчага аддзялення спеваў і кампазіцыі пры Беларускай акадэміі музыкі.

Стымулам для дасягнення асаблівых поспехаў у вывучэнні асобных дысцыплін і ў навукова-тэхнічнай творчасці можа стаць для студэнтаў персанальная стыпендыя савета ВНУ, якая складае 210 працэнтаў мінімальнай заработнай платы.

Для пэўных груп навучэнскай моладзі пастановай прадугледжана надбаўка ў размеры 50 працэнтаў да ўстаноўленай стыпендыі. У першую чаргу ў дакуменце названы тыя, хто атрымлівае льготы ў адпаведнасці з артыкуламі 18-20 і 23-25 Закону Рэспублікі Беларусь "Аб сацыяльнай абароне грамадзян, якія пацярпелі ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС". На тую ж надбаўку могуць разлічваць студэнты вышэйшых і навучэнцы сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў з ліку былых ваеннаслужачых, якія сталі інвалідамі ў выніку ранення, кантузіі, калецтва ці захворвання, атрыманых пры выкананні інтэрнацыянальнага абавязку, а таксама інваліды 1-ай і 2-ой груп па зроку і глуханямыя.

50 працэнтаў устаноўленых размераў стыпендый кожны месяц будуць атрымліваць тыя, хто знаходзіцца ў акадэмічным водпуску па медыцынскіх паказаннях. Выплачвацца гэта сума будзе за кошт сродкаў навучальных устаноў на працягу ўсяго перыяду акадэмічнага водпуску.

Устанаўліваюцца ўсе вышэйназваныя стыпендыі ў адпаведнасці з інструкцыямі аб парадку назначэння і выплаты стыпендый студэнтам ВНУ ці навучэнцам сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, зацверджанымі Міністэрствам адукацыі і навукі па ўзгадненню з Міністэрствам працы Міністэрствам фінансаў.

Для назначэння навучальнай стыпендыі бал паспяховасці ў студэнтаў ВНУ гуманітарных, педагагічных і эканамічных спецыяльнасцей павінен быць не ніжэйшы чым 3,6, а прыродазнаўчанавуковых, тэхнічных, медыцынскіх, сельскагаспадарчых, ваенных спецыяльнасцей, а таксама ў навучэнцаў сярэдніх спецыяльных устаноў -- не ніжэйшы чым 3,4.

Для тых, хто страціў права на атрыманне навучальнай стыпендыі і знаходзіцца ў цяжкім матэрыяльным становішчы, гэтай пастановай даецца выратавальная саломінка. Кіраўнікам вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў дазволена назначаць гэтай катэгорыі студэнтаў і навучэнцаў сацыяльную стыпендыю. Праўда, выкарыстаць такую магчымасць можна не больш чым два разы за ўвесь перыяд навучання. Указаная стыпендыя назначаецца па прадстаўленню дэканаў факультэтаў (намеснікаў дырэктараў па навучальнай рабоце) па ўзгадненню з прафсаюзнымі, студэнцкімі (вучнёўскімі) арганізацыямі ў межах планавага стыпендыяльнага фонду.

**Вольга ШЧАДРЫНА, БЕЛТА.**

# КОНКУРС: "НАВУКА-96"

Фонд фундаментальных даследаванняў Рэспублікі Беларусь арганізуе конкурс праектаў фундаментальных і пошукавых даследаванняў "Навука-96" з мэтай выяўлення і фінансавай падтрымкі творчых навуковых калектываў і асобных вучоных у рашэнні актуальных навуковых праблем з улікам тэндэнцый развіцця сусветнай і айчыннай навукі, а таксама інтарэсаў эканамічнага і культурнага развіцця Беларусі.

У адпаведнасці са Статутам асноўнай мэтай фонда з'яўляецца падтрымка ініцыятыўных кароткатэрміновых праектаў. Конкурс "Навука-96" праводзіцца як адкрыты конкурс без абмежавання тэматыкі. На конкурс прымаюцца заяўкі творчых навуковых калектываў і асобных вучоных Рэспублікі Беларусь.

Па выніках конкурсу ажыццяўляецца мэтавае фінансаванне праектаў фундаментальных і пошукавых даследаванняў, якія прайшлі адбор у секцыях савета Фонда на аснове заключэнняў незалежных экспертаў і прынятых да фінансавання пленарным пасяджэннем савета Фонда, на аснове дагавораў выканаўчай дырэкцыі Фонда з юрыдычнымі і фізічнымі асобамі — выканаўцамі праектаў.

Пачатак фінансавання прайшоўшых па конкурсу праектаў плануецца ажыццяўляць са студзеня 1997 г.

На конкурс "Навука-96" вылучаюцца праекты, здольныя ўнесці істотны ўклад у пашырэнне і паглыбленнне навуковых ведаў, якія адрозніваюцца навізной і арыгінальнасцю ў пастаноўцы і правядзенні фундаментальных і пошукавых даследаванняў і накіраваныя на дасягненне якасна новых навуковых вынікаў.

Пры разглядзе праектаў будуць ацэньвацца:

-- адпаведнасць чакаемых вынікаў сусветнаму навуковаму ўзроўню;

-- актуальнасць тэматыкі;

— навуковая абгрунтаванасць кіраўніка праекта і ўсяго навуковага калектыву;

-- дастатковасць навуковага задзелу і неабходнай матэрыяльна-тэхнічнай базы.

Перавагу пры праходжанні конкурсу пры іншых роўных умовах будуць мець праекты, выканаўцы якіх маюць пагадненні аб сумесных з замежнымі вучонымі работах або дакументы аб намерах.

Тэрмін выканання праекта не павінен перавышаць 2-х гадоў і толькі ў асобных выпадках можа складаць 3 гады. Дубліраванне планавай тэматыкі не дапускаецца.

Праекты, якія ўдзельнічалі ў папярэдніх конкурсах або па зместу супадаючыя з такімі, да ўдзелу ў конкурсе "Навука-96" не прымаюцца.

Прапановы на конкурс прадстаўляюцца да 18 сакавіка г.г. уключна.

Матэрыялы накіроўваюцца на адрас выканаўчай дырэкцыі Фонда фундаментальных даследаванняў Рэспублікі Беларусь па адрасу: 220072, г.Мінск, пр-т Ф.Скарыны, д.66, п.414, тэл. для даведак 39-48-90, 39-57-22.

За падрабязнымі даведкамі звяртацца ў навуковы аддзел ГДУ.



# ПАДАРУНАК АД ЭКОЛАГАЎ

Біялагічны факультэт нашага універсітэта, які рыхтуе высокакваліфікаваныя кадры па ахове прыроды, адчувае сёння ў гэтым цяжкасці з-за нялёгкага эканамічнага становішча ў краіне. І таму асабліва прыемна ўсведамляць, што знаходзяцца людзі, якія думаюць аб тым, як падтрымаць вышэйшую школу, навуку, студэнцкую моладзь -- будучыню нацыі. А вырашыў дапамагчы біяфаку універсітэта абласны камітэт прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя. І нядаўна прарэктар па вучэбнай і выхаваўчай рабоце М.М.Воінаў, дэкан факультэта С.Ф.Алешка, загадчык кафедры заалогіі і аховы прыроды А.У.Гаўрылаў, прафесар кафедры батанікі і фізіялогіі раслін В.В.Валетаў, студэнты прымалі у дар ад старшыні камітэта М.А.Мачуленкі і начальніка аддзела аналітычнага кантролю, былой выпускніцы біяфака ГДУ М.Р.Драбышэўскай прыборы на значную грашовую суму -- 3 дазіметры шырокага спектра дзеяння, фотаэлектракаларыметр, вагі. З іх дапамогай больш наглядным стане вучэбны працэс, студэнты змогуць выконваць курсавыя работы не чыста апісальнага, а даследчага характару.





--Мы вельмі зацікаўлены ва ўмацаванні матэрыяльнай базы біяфака ГДУ для падрыхтоўкі спецыялістаў-эколагаў, -- адзначыў М.А.Мачуленка. -- Іх пакуль вельмі мала, і мы падтрымліваем ідэю аб стварэнні кафедры экалогіі і генетыкі для навучання такіх спецыялістаў. Запрашаем студэнтаў для праходжання вучэбных, пераддыпломных практык на базе нашай лабараторыі экалагічнага кантролю. Мы плануем рэканструкцыю гомельскага нацыянальнага парка, закладку батанічнага сада, узнаўленне аранжэрэй і спадзяемся на актыўны ўдзел у гэтай рабоце студэнтаў-біёлагаў.

У адрас спонсараў прагучалі словы шчырай удзячнасці ад кіраўніцтва ГДУ, біяфака, а таксама яго студэнтаў.

**Т.ДУБЯК.**

**НА ЗДЫМКАХ:** М.А.Мачуленка ўручае М.М.Воінаву дакументы на абсталяванне; у час перадачы прылад біялагічнаму факультэту.

Фота У.Чысціка.

# НА МІЖНАРОДНАЙ КАНФЕРЭНЦЫІ

У Мінску на базе Беларускай дзяржаўнай політэхнічнай акадэміі прайшла міжнародная навукова-тэхнічная канферэнцыя "Удасканаленне працэсаў фінішнай апрацоўкі ў машына- і прыборабудаванні, экалогія і ахова навакольнага асяроддзя".

Арганізатарамі канферэнцыі былі Міністэрства адукацыі і навукі Рэспублікі Беларусь, Фізіка-тэхнічны інстытут АН Беларусі, Беларускае рэспубліканскае навукова-вытворчае аб"яднанне парашковай металургіі, навукова-даследчы тэхналагічны інстытут аптычнага станкабудавання і вакуумнай тэхнікі.

На канферэнцыі было заслухана 179 дакладаў, у якіх адлюстраваны прагрэсіўныя фізіка-хімічныя метады фінішнай апрацоўкі і выкарыстоўваемае абсталяванне, разгледжаны некаторыя трыбатэхнічныя аспекты адбываючыхся пры гэтым працэсаў, а таксама пытанні матэматычнага мадэлявання і кіравання заканамернасцямі здымання прыпуску на стадыі канчатковых аперацый з мэтай інтэнсіфікацыі і аўтаматызацыі формаўтварэння. Акрамя таго, былі закрануты пытанні, прысвечаныя сістэмам аўтаматызаванага праекціравання тэхналагічных працэсаў, праблемам забеспячэння якасці, сертыфікацыі, экалогіі і абароны навакольнага асяроддзя ў машына- і прыборабудаванні.

Гомельскі дзяржуніверсітэт быў прадстаўлены на канферэнцыі двума дакладамі, прысвечанымі праблеме вызначэння шурпатасці паверхні аптычных вырабаў.

**В.СЕРАБРАКОЎ.**

# ДЫСЕРТАЦЫЮ АБАРАНІЛА СОРАСАЎСКАЯ АСПІРАНТКА

У мінулым годзе пры нашым універсітэце ў адпаведнасці з рашэннем БелВАКа створаны спецыялізаваны савет "Матэматычная логіка, алгебра і тэорыя лічбаў" па абароне доктарскіх і кандыдацкіх дысертацый. На пачатку яго дзейнасці вызначыўся дацэнт кафедры алгебры і геаметрыі С.Ф.Каморнікаў. На першым пасяджэнні гэтага савета ён бліскуча абараніў дысертацыю на атрыманне вучонай ступені доктара фізіка-матэматычных навук. А нядаўна строгі экзамен трымала сорасаўская аспірантка А.П.Аўдашкова -- вучаніца кіраўніка шырока вядомай Гомельскай алгебраічнай школы акадэміка Беларускай нацыянальнай акадэміі адукацыі прафесара Л.А.Шамяткова. Абарона дысертацыі на атрыманне вучонай ступені кандыдата фізіка-матэматычных навук у маладой вучонай таксама прайшла паспяхова.

**Кнігі нашых вучоных**

# ВЫХАВАННЕ ЧАЛАВЕЧНАСЦІ -- ПРАЗ ЛЮБОЎ ДА ПРЫРОДЫ

**Выйшаў у свет дапаможнік для выхавацеляў і настаўнікаў "Ігравыя экалагічныя заняткі з дзецьмі" (Мінск, "Ассар", 1995, 128 с.), аўтарам якога з"яўляецца кандыдат біялагічных навук дацэнт універсітэта Лідзія Пятроўна Моладава.**

Мэта выдання -- дапамагчы педагогам і бацькам выхаванню ў дзяцей экалагічнай культуры. Аб вастрыні і важнасці гэтай праблемы ў нашай краіне можна гаварыць шмат. Крыўдна, калі замежныя госці, якія прыязджаюць да нас цяпер не так ужо рэдка, убачыўшы нашы родныя мясціны і адносіны да прыроды з боку людзей, выказваюцца так: "Свінства". Крыўдна, але справядліва.

Аўтар кнігі прапануе 24 распрацоўкі ігравых заняткаў з дзецьмі ад 2-х да 12-ці гадоў і старэй. У змест гэтых заняткаў уключаны разнастайныя гульні, вялікі літаратурны і фальклорны матэрыял. Многія гульні можна праводзіць не толькі з дашкольнікамі і малодшымі школьнікамі, але і з рабятамі сярэдняга школьнага ўзросту.

У кнізе прыводзіцца азначэнне паняцця "экалогія" як навукі аб узаемаадносінах жывых арганізмаў паміж сабой і з навакольным асяроддзем. Састаўной часткай экалагічнага выхавання лічыцца выхаванне любві да прыроды. Падвяргаюцца крытыцы (і не беспадстаўна!) нярэдкія прыёмы такой "любві", як утрыманне ў няволі дзікіх жывёлін, якія пакутуюць на вачах у дзяцей, як збіранне кветак і вылоўліванне матылёў і іншых насякомых, марыцелямі якіх з"яўляюцца дзеці. Прывучаюцца дзеці і да варварскіх адносін да прыроды як так званымі "выхаваўчымі мерапрыемствамі", так і дзіцячай літаратурай тыпу такіх "шэдэўраў" як:

"Колкую, зеленую
Срубили топором,
Из лесу душистая
К нам приходит в дом"

(З праграмы навагодняга ранішніка).

Рэдкімі становяцца многія звычайныя калісьці расліны і жывёлы, збяднелі некалі багатыя грыбамі і ягадамі прыродныя куткі, забруджана вада, паветра, глеба... І да ўсіх гэтых "дасягненняў" грамадства так ці інакш маюць дачыненне педагогі, як састаўная частка гэтага грамадства, адказная за выхаванне дзяцей і падлеткаў. Педагогі не спраўляюцца з ускладзенай на іх місіяй выпускаць са школы ў жыццё правільна экалагічна выхаваных людзей.

Аўтар дапаможніка не толькі выказвае сваю заклапочанасць такім экалагічным невуцтвам, але і прапануе хутчэй штосьці зрабіць, каб новыя пакаленні маглі пазбегнуць памылак, якія прыводзяць да экалагічных бедстваў.

У навуковых меркаваннях аўтара змешчаны важныя думкі, сутнасць якіх заключаецца ў тым, што экалагічнае выхаванне мае на ўвазе перш за ўсё выхаванне чалавечнасці, г.зн. дабрыні, натуральных адносін да прыроды і людзей, якія жывуць сярод гэтай прыроды. Нашчадкам трэба пакінуць Зямлю прыгоднай да паўнацэннага жыцця, а г.зн., што неабходна навучыць маладое пакаленне разумець сябе і ўсё, што адбываецца вакол нас, так як з-за адсутнасці ведаў яно не можа выбраць правільны накірунак паводзін. Экалагічную выхаваўчую работу неабходна зрабіць прыцягальнай у агульнадзяржаўным маштабе. Для дзяцей гэта гульня, натуральная і радасная, але якая фарміруе іх светапогляд, для педагогаў і бацькоў -- найпершы ўзаконены абавязак.

Для дзяцей гульня, як натуральны і радасны від дзейнасці, фарміруе іх характар, асабістыя якасці, на падставе набытых ведаў, навыкаў і ўменняў паводзіць сябе ў натуральным асяроддзі. У гэтых адносінах праблемы, узнятыя ў дапаможніку, набываюць асабліва важны сэнс ва ўмовах, выкліканых чарнобыльскай катастрофай, з вынікамі якой мае няшчасце жыць беларускі народ.

**М.ДЗМІТРЫЕЎ,**
**доктар педагагічных навук, прафесар, акадэмік Міжнароднай акадэміі тэхнічнай адукацыі.**

**У РЭДАКЦЫЙНАЙ ПОШЦЕ -- ПАЭЗІЯ**

**Алексей ФЕСЬКОВ**

## СВЕТ ОГНЯ

*И свалился камень*
*На холодный камень,*
*И взметнулся пламень*
*Над землёй без ставень.*
*Попросило света*
*У огня живое,*
*Засмеялось где-то*
*Существо земное.*
*Посыпалось солью*
*В вареве съедобное,*
*Засыпало с болью*
*У костра свободное.*

*Облизнулся пламень*
*У хлебного теста,*
*Целовался парень*
*Пламенно с невестой.*
*Затрещали искры*
*В необъятном пламени,*
*Покорившись мысли*
*На пурпурном знамени.*
*Заискрился лазер*
*В отступившем мраке,*
*Мне бы только света*
*Без вражды и драки.*

## НЕ ОЖИДАЯ НОЧИ

*О чужих ошибках,*
*О своих достоинствах*
*Спорим без излишка*
*И зазренья совести.*

*По рукам знакомых*
*И морщинкам сверстников*
*Судим о весомости*
*Диспутов бессмертия.*

*По словам израненным,*
*И застывшей мимике*
*С горьким опозданием*
*Признаем ошибки мы.*

*Об ушедших гениях*
*И талантах скошенных*
*Сколько сожаления*
*В душах опустошенных!*

*Нам бы с покаянием --*
*Кто есть и кто уходит --*
*Но без опоздания.*
*Не ожидая ночи.*



# ТАЛЕНТ НЯСТОМНАЙ ПРАЦЫ

*Народнаму пісьменніку Беларусі Івану ШАМЯКІНУ -- **75** гадоў*

У 24 гады, пасля заканчэння Вялікай Айчыннай вайны, малады тады яшчэ Іван Шамякін паставіў сабе адказную задачу: "Пісаць, пісаць і яшчэ раз пісаць, не спыняцца ні на хвіліну". У той час яго літаратурны багаж быў невялікі -- апавяданне "У снежнай пустыні" і невялікая аповесць "Помста".

Асновай для выканання вызначанага дэвіза было жыццё, якое ва ўсёй разнастайнасці пазнаў наш зямляк. Даволі вялікая вёска Карма, што ў Добрушскім раёне, якраз на сумежжы трох, як раней любілі гаварыць і пісаць, братніх рэспублік. Сведчаннем таму -- у некалькіх кіламетрах манумент Дружбы трох усходнеславянскіх народаў.

Тут 30 студзеня 1921 года і нарадзіўся будучы пісьменнік. Поўдзень Беларусі, раўніннае поле і вялікія лясістыя масівы -- прырода, якая назаўсёды захапіла Івана Шамякіна. Лес цесна звязаны з лёсам пісьменніка. Ён даваў работу бацьку, які быў леснікам у былым Цехаўскім і Гомельскім раёнах. Лес даваў ежу, ён стаў вялікай кнігай жыцця. Сямігодка, вучоба ў Гомельскім тэхнікуме будаўнічых матэрыялаў, дзе, дарэчы, ён асвойваў спецыяльнасць будаўніка і паспрабаваў сябе ў паэзіі. У тыя гады пры "Гомельскай праўдзе" было даволі моцнае літаратурнае аб"яднанне. Тут ён пазнаёміўся з Леанідам Гаўрылавым, Кастусём Кірэенкам, Дзмітрыем Кавалёвым.

Па заканчэнні тэхнікума І.Шамякін быў накіраваны ў толькі што вызвалены Беласток, адкуль і быў прызваны ў Чырвоную Армію. А потым доўгія вёрсты вайны. Вось, думаецца, з дзяцінства, няўрымслівага юнацтва і суровых ваенных выпрабаванняў -- упэўненасць у ажыццяўленні намечанага дэвіза. "У мяне быў вагон цудоўнага матэрыялу для рамана..." -- пісаў у аўтабіяграфіі будучы майстра слова. І неўзабаве раман "Глыбокая плынь" захапіў чытачоў вострым сюжэтам, цікавай падачай падзей і персанажаў. Матэрыялам для яго паслужылі ўспаміны родных і блізкіх празаіка аб акупацыі мясцін і ўсенародным змаганні на Гомельшчыне. Важна зазначыць, што за стварэнне рамана ўзяўся па сённяшніх мерках юнак, і што пісаў яго чалавек, здавалася б, у невыносных фізічных умовах. Пасляваенная разруха, галадоўніца. Удзень праца ў Пракопаўскай сямігодцы, дзе выкладаў аж чатыры прадметы, увечары як сакратар партыйнай арганізацыі ішоў у адзін з шасці калгасаў сельсавета, каб правесці сход ці семінар агітатараў. А ўначы пры газнічцы ў халоднай хаце, бо не было шкла, каб уцяпліць вокны, пісаў. А да таго ж трэба было завочна вучыцца: у 1946 годзе паступіў у Гомельскі педагагічны інстытут імя В.П.Чкалава.

Смеласць і працавітасць, глыбокае веданне жыцця -- вось што, думаецца, прадвызначыла поспех слыннага сёння пісьменніка. Смеласць безумоўная, бо не было вопыту напісання твораў, спецыяльнай літаратурнай падрыхтоўкі. Надзённа гучаць яго ныя словы, сказаныя напрыканцы 1992 года: "Здорава нас навучылі пляскаць і крычаць "ура" і дрэнна вучылі аналізаваць сацыяльныя з"явы. А вучыцца было ў каго -- у Купалы, Коласа, Гарэцкага. Маладыя, без вышэйшай адукацыі, яны выдатна гэта рабілі. А ў нас столькі пісьменнікаў -- дактароў навук. І што? Дзе сацыяльны аналіз сённяшняга жыцця?"

Працавітасць у І.Шамякіна незвычайная. І не толькі ў маладыя, а і сталыя гады, калі ён стаў вядомым пісьменнікам, грамадскім, палітычным дзеячам. Здзіўляюцца не толькі простыя чытачы, а паплечнікі па пяру, якія добра адчулі цяжкасці пісьменніцкай работы. Так, наш вядомы зямляк народны пісьменнік Беларусі Іван Навуменка са здзіўленнем і захапленнем піша: "Сядзе ён сёння на ўвесь рабочы дзень за рабочы стол? Ці яму а дзесятай раніцы адкрываць сесію, старшынстваваць на пасяджэнні Вярхоўнага Савета БССР? Ці падавацца ў Саюз пісьменнікаў -- на чарговы пленум, пасяджэнне прэзідыума праўлення Саюза пісьменнікаў БССР, на рэдкалегію "Полымя" ці проста ў Саюз пісьменнікаў..." А яшчэ 12 гадоў -- галоўны рэдактар Беларускай энцыклапедыі.

І калі ён толькі паспявае? Толькі адзін пералік твораў, сярод якіх вялікія па аб"ёму і цяжкія па жанру раманы "У добры час", "Крыніцы", "Сэрца на далоні", "Снежныя зімы", "Атланты і карыятыды", "Вазьму твой боль", "Петраград-Брэст", "Зеніт", "Злая зорка", пенталогія "Трывожнае шчасце", а яшчэ аповесці, апавяданні, п"есы, публіцыстычныя і крытычныя артыкулы, кінасцэнарыі, склаў бы гонар і славу пісьменніку сусветнага ўзроўню. Варта зазначыць, што амаль усе яго значныя творы экранізаваны ці па іх пастаўлены спектаклі.

У чым жа сакрэт поспеху вялікай чытабельнасці шамякінскіх твораў? Літаратуразнаўцы адзначаюць ягонае ўменне будаваць сюжэт, кампазіцыю твора. Многіх прафесійных мастакоў слова ўражвае ў нашым пісьменніку арганічнае яднанне гісторыка-рэвалюцыйнай тэматыкі з праблемамі сучаснага жыцця. І гэта заканамерна для творчага крэда І.Шамякіна, які лічыць, што без гісторыі няма сучаснасці, і што гісторыя немагчыма без заглядвання наперад, у заўтрашні дзень. І гэта так. Амаль усе творы народнага пісьменніка добра вылучаюцца такім адзінствам. Асабліва гэта тычыцца тых твораў, дзе цесна пераплятаюцца лёсы герояў, якімі сёння нялёгка даюцца згадкі ваеннага ліхалецця.

Поспех твораў І.Шамякіна яшчэ і ў тым, што з"яўляючыся глыбока нацыянальнымі, карэннямі ўросшымі ў зямлю беларускую, яны сталі інтэрнацыянальнымі, дасягненнямі сусветнай літаратуры. Усе яго значныя творы перакладзены на многія мовы свету. Так, гаворачы пра раман "Сэрца на далоні", вядомы рускі пісьменнік Сяргей Баруздзін адзначаў, што гэтым раманам "Іван Пятровіч выйшаў да ўсесаюзнага і шырэй -- сусветнага чытача. Тут ёсць аб чым падумаць. Не буду называць іншых беларускіх пісьменнікаў, паколькі яны ўсе на памяці, але бяру на сабе смеласць сказаць, што Іван Пятровіч быў адным з першых, з каго пачаўся рух сучаснай беларускай прозы ў свет".

У І.Шамякіна не толькі выдатнае адчуванне часу. У сваіх творах ён уздымае як нацыянальныя, так і агульналюдскія каштоўнасці -- праблемы жыцця і смерці, кахання і вернасці, абавязку, сумлення і гонару.

Сярод сакрэтаў пісьменніцкага поспеху нельга не адзначыць жыццялюбства Івана Шамякіна, яго чалавечнасць, спагадлівасць, шчырасць у адносінах да людзей, таварышаў па пяру, працы і не ў меншай ступені, а можа і ў большай, да сям"і, родзічаў, дзяцей. І гэта не выпадкова, бо з малой Радзімы, лесніčоўкі ў барах і пушчах роднай Гомельшчыны, на яе гонях і сенажацях пачыналася жыццё чалавека, пісьменніка, грамадзяніна нашай вялікай Радзімы.

А, бадай, яшчэ пра надзвычай галоўную рысу народнага пісьменніка Беларусі, Героя Сацыялістычнай Працы, акадэміка АН Беларусі, носьбіта многіх па заслугах рэгалій -- гэта дабрыня. Дабрыня -- таму што Іван Пятровіч Шамякін родам з Добрушскага раёна нашай Гомельшчыны, а там нарадзіліся, жывуць і працуюць сардэчныя і надзвычай добрыя людзі, многія з якіх сталі і яшчэ стануць героямі новых твораў выдатнага празаіка.

**М.ВОІНАЎ,**
**кандыдат філалагічных навук.**

# НА ЗЯМЛІ, АПЕТАЙ ІВАНАМ МЕЛЕЖАМ



Яго нарадзіла зямля Беларусі, нашай роднай Гомельшчыны, каб ён разгледзеў на ёй кожнае дрэўца, травінку, убачыў, як наліваецца колас, як выплывае месяц на сіні начлег, пачуў усплёск хваль Прыпяці, каб потым стаў песняром Палесся.

Сёння ўзрушаная памяць вяртае мяне і да гэтага цудоўнага краю, радзімы Івана Мележа, і да незабыўных сустрэч з землякамі пісьменніка, якія традыцыйна адбываюцца кожныя пяць гадоў. Скрозь прызму гэтых сустрэч больш велічнымі здаюцца і сама постаць класіка нацыянальнай літаратуры, і яго творчасць, у якой, як у люстэрку, адбіліся найбольш значныя вехі з жыцця народа і краіны.

1976, 1981, 1986, 1995 гады -- гэта гады сустрэч студэнтаў і выкладчыкаў нашага універсітэта з зямлёй, апетай Мележам.

Студэнты-філолагі ведалі, што для больш глыбокага разумення сапраўднага таленту трэба наведаць яго Радзіму, тыя мясціны, дзе ён узрос, "дзе чуў цеплыню матчыных рук і матчынага сэрца".

Кожная такая сустрэча пераўтваралася ў сапраўднае свята. Гэта былі сустрэчы не толькі з Палессем, але і з мележаўскімі героямі, людзьмі, якія выклікалі да жыцця кнігі пісьменніка.

Як толькі аўтобус зварочваў у вёску, студэнты з хваляваннем углядаліся ў глінішчанскія прысады, паляшуцкія хаты, калодзежныя "жураўлі" каля іх, блакітнае палескае неба. Усё здавалася звычайным, але разам з тым усё бачылася скрозь паэтычную прызму трылогіі "Палеская хроніка". Тут жылі, працавалі, кахалі адзін аднаго героі Мележа, тут закладвалі яны асновы новага жыцця, змагаліся за сваё шчасце.

Палеская зямля свята шануе памяць свайго песняра. Яго імя носіць Глінішчанская сярэдняя школа, у якой добрым словам успамінаюць вучні "дзядзьку Івана", што зрабіў многае для яе будаўніцтва. Тут адкрыты музей Івана Мележа, дзе ў кожным з яго пакояў працягвае "жыць" пісьменнік.

На зямлі, апетай Мележам, яшчэ і яшчэ раз адчуваеш, што значыць родная, бацькоўская зямля ў жыцці кожнага чалавека, што такая зямля, як палеская, не магла не нарадзіць пісьменніка, які стаў яе песняром.

Поўныя незабыўных уражанняў заўсёды вяртаюцца студэнты ў родны Гомель. Вось і сёння за вокнамі -- зіма. Месяц нараджэння Івана Паўлавіча Мележа. У студэнтаў закончылася гарачая пара -- экзамены. Яны ў чаканні новых сустрэч з цікавымі людзьмі, шчырымі прыхільнікамі мележаўскага таленту. Думаецца, што такія сустрэчы духоўна ўзбагачаюць моладзь, далучаюць да непаўторнага свету мастацтва, той вялікай літаратуры, якой наканавана жыць вякі. Для будучых настаўнікаў, прапагандыстаў роднага слова, роднай літаратуры такія сустрэчы карысныя ўдвайне: яны адкрываюць новыя, цікавыя старонкі з жыцця класіка нашай літаратуры, дапытлівага і чулага чалавека, вечнага, нястомнага шукальніка новага, непазнанага. Адкрываюць, каб пасля гэтак жа ўсхвалявана расказваць аб тым, што ведаюць, сваім выхаванцам.

**Валянціна СМЫКОЎСКАЯ,**
**дацэнт кафедры беларускай літаратуры.**

***

Студэнцкая пара -- гэта пара сустрэч, паходаў, экскурсій. У жыцці кожнага з нас яны былі свае, непаўторныя, незабыўныя. Але найбольш запомнілася мне сустрэча з зямлёй Івана Мележа -- народнага пісьменніка Беларусі, якая адбылася ў мінулым годзе. Помню, як мы, студэнты III курса філфака, з вялікай ахвотай прынялі прапанову Веры Савельеўны Генаш наведаць радзіму Івана Мележа, тыя мясціны, дзе ён узрос, якія пасля знайшлі сваё паэтычнае ўвасабленне ў яго трылогіі "Палеская хроніка".

Аўтобус хутка даімчаў нас да гэтага цудоўнага куточка Палесся. І вось справа -- вясковая школа, помнік песняру зямлі палескай, злева -- музей, які адкрыты ў яго гонар. Ускладваем кветкі. Гэта даніна нашай павагі да яго, нашай памяці аб сваім земляку.

Дырэктар музея запрашае нас у гэты невялічкі домік, звычайны, вясковы. Пераступаем яго парог і ўяўляем наступнае: быццам сам Іван Паўлавіч знаходзіцца тут: вось ён распрануўся, паспешліва паставіў партфель. З цікавасцю разгледзеў шматлікія дакументы і публікацыі і здзівіўся, што гэта ўсё -- пра яго. Ён акуратна адсоўвае крэсла і, выцягнуўшы стамлёныя ад доўгай хады ногі, некалькі хвілін сядзіць у задуменні. А потым пачынае пісаць. І пішацца яму надзіва лёгка і спакойна.

Усё ўяўлялася нам такім прывычным і знаёмым: і пішучая машынка, і кнігі, якія чытаў ён, і дарагія яму рэчы. Кожная з іх -- частка жыцця вялікага пісьменніка.

А калі мы слухалі шчырае і спагадлівае слова пра Івана Мележа, гэтага незвычайнага чалавека, думалася, што нам, маладым, не хапае сёння яго бацькоўскай дабрыні, настаўніцкай строгасці, чалавечай спагады і добразычлівасці, народнай мудрасці і праніклівай разважлівасці, яго вопыту і яго прыкладу ў працы.

Суцяшала хіба адно: што ўсё гэта засталося ў яго кнігах, засталося для нас, для моладзі, заўтрашніх настаўнікаў, застанецца, я перакanана ў гэтым, для нашых дзяцей і ўнукаў, удзячных нашчадкаў.

Хаця чамусьці часам здаецца, што сённяшнія школьнікі ўжо не чытаюць сваіх пісьменнікаў з тым пачуццём, з якім іх чыталі нядаўна мы. Вельмі ўсё перайначылася ў духоўным і культурным жыцці нашага народа. Даволі лёгкім стаў доступ да прадметаў і з"яў мастацтва, да крыніц эстэтычнай інфармацыі. А хацелася б, каб такую цікавую кнігу, як "Палеская хроніка" Івана Мележа, кнігу, напісаную на простай і зразумелай матчынай мове, яны чыталі і перачытвалі многа разоў.

Хойніцкае Палессе... Нядаўна тут была трыццацікіламетровая зона. Яшчэ нядаўна мы пісалі і гаварылі пра забруджаныя радыяцыяй воды Прыпяці, атрутныя крыніцы і ручаі. Некаторыя з землякоў Івана Мележа пакідалі спаконвечную зямлю, самае святое і дарагое -- Радзіму. Але расстанне не магло адарваць іх душу ад родных студняў, двароў, хат. Нібы вугалёк цепліцца ў сэрцах тых, хто жыве сёння ў Глінішчах, хто вяртаецца на зямлю, апетую Мележам. Бо жыве ў чалавечых сэрцах надзея, што не патухне жыццё ў палескім краі, сынам і песняром якога быў, ёсць і будзе Іван Паўлавіч Мележ.

**Кацярына ХАЗАНАВА,**
**студэнтка IV курса беларускага аддзялення філалагічнага факультэта.**





**Даўно існуюць цесныя сувязі паміж кафедрай беларускай мовы нашага універсітэта і вядучымі мовазнаўцамі Беларусі, якія рэгулярна выступаюць перад студэнтамі філалагічнага факультэта з лекцыямі, кіруюць дыпломнымі работамі.**

**На здымку (злева направа): прафесар кафедры беларускай мовы У.В.Анічэнка, дырэктар Інстытута мовазнаўства імя Я.Коласа Акадэміі навук Рэспублікі Беларусь акадэмік А.І.Падлужны, малодшы навуковы супрацоўнік лінгвістычнай лабараторыі В.А.Скачкова, загадчык аддзела гісторыі мовы названага інстытута член-карэспандэнт АНБ А.М.Булыка і студэнтка 5-га курса філалагічнага факультэта Т.П.Адамава.**

**Фота У.Чысціка.**

*ПРА ГОРАД-ПАБРАЦІМ*

# АБЕРДЗІН: ЖЫЦЦЁ І ТРАДЫЦЫІ

***Шатландскі горад Абердзін -- пабрацім нашага Гомеля, і таму нам уяўляюцца цікавымі ўсе звесткі аб ім. Значна пашырыць іх мы можам з дапамогай ніжэй змяшчаемага матэрыялу. Яго, як і іншыя публікацыі аб Шатландыі, што друкаваліся на старонках нашай газеты ў бягучым навучальным годзе, падрыхтавала ўдзельніца народнай харавой капэлы "Дзянніца" Э.Лізарава. (Нагадаем, што мінулым летам гэтаму калектыву пашчасціла прымаць удзел у міжнародным фестывалі мастацтваў, які праходзіў у г.Абердзіне.).***

Нафтавая кампанія "Комікл Маракан" пачала здабываць нафту ў 1960 годзе з марскіх платформаў і аказала вялікі ўплыў на жыццё абердзінцаў. Змянілася структура працоўных месцаў у горадзе ў сувязі з пабудовай чыгуначнай лініі, узнікненнем бізнес-кварталаў і офісаў. Многім работнікам давялося прайсці перанавучанне, каб усталявацца ў новых умовах жыцця. У індустрыі абслугоўвання ў цяперашні час заняты 71% працаздольнага насельніцтва. Паслугі забяспечваюць у Англіі 65% вытворчасці валавога прадукта краіны.

Абердзінскія падаткаплацельшчыкі ўтрымліваюць 20 тысяч студэнтаў, што складае 10% ад колькасці жыхароў горада. Экскурсаводы з гонарам абвяшчаюць, што ў Абердзіне ў свой час вучыўся Петр I. У часопісе ж "Наука и жизнь" расказваецца аб жыцці Максвэла Джэмса Клерка ў Абердзіне. Дом, у якім жыў выдатны англійскі фізік, адзін з заснавальнікаў тэорыі электрамагнетызму, застаўся такім жа, як у XIX ст., толькі на вокнах другога паверха з"явіліся скрыні з квітнеючымі гeранямі, якія яшчэ раз пацвярджаюць, што ў горадзе чыстае паветра і добра працуе муніцыпалітэт. Назва вуліцы так і не змянілася з тых часоў -- Уніон стрыт.

У горад прывозяць 4 млн. назваў тавараў. Завозяць драўніну для папяровых фабрык. 60% даходаў горад атрымлівае ад порта за кошт продажу нафты. Аб узроўні заможнасці грамадзян можна меркаваць па сярэднегадовай заработнай плаце. Экскурсавод атрымлівае 9500 фунтаў, а самы высокааплачваемы работнік -- 50000.

Такім чынам, сярэдняя зарплата экскурсавода ў месяц складае 800 фунтаў. За кватэру трэба плаціць 150 фунтаў у месяц, астатняе траціць на жыццё. Калі жадаеце разбагацець, адмаўляйце сабе ва ўсім і трымайце сувязі з банкам. Сучасны дом каштуе 200 000 -- 250 000 фунтаў. Нашы знаёмыя з таварыства "Сябры Гомеля" усе маюць катэджы.

Снеданак у кафэ каштуе 2-3 фунты. Аплата за праезд у грамадскім транспарце бярэцца пры ўваходзе ў аўтобус самім шафёрам у памеры 1 фунта без уліку адлегласці.

У Шатландыі і Англіі практыкуецца асобнае навучанне хлопчыкаў і дзяўчынак. Школы ствараюцца з улікам патрабаванняў бацькоў да навучання з мэтай захавання нацыянальных традыцый. Англія -- шматнацыянальная краіна і для захавання ўсіх патрабаванняў насельніцтва ствараюцца прыватныя, муніцыпальныя і дабрачынныя формы навучання. Рэлігійныя абшчыны прадстаўлены у гарадах каталіцкімі, праваслаўнымі, рымска-каталіцкімі, мусульманскімі і іншымі храмамі.

Моўныя праблемы вырашаюцца па жаданні сям"і і залежаць ад яе матэрыяльнага забеспячэння, а таксама ад здольнасцей канкрэтнага чалавека з улікам яго будучай прафесіі або сферы дзейнасці. У Абердзіне мы сустракалі людзей, якія размаўляюць на шатландскім дыялекце англійскай мовы, англійскай мове, хаця гістарычна ў гэтых землях ужывалася кельцкая мова. Шматнацыянальнасць насельніцтва прыводзіць да агульнай думкі, што лепш ведаць больш моў, а не толькі сваю нацыянальную, каб паўней выкарыстоўваць магчымасць перамяшчэння па краінах свету і лепш разумець адзін аднаго пры зносінах.

Каб харчавацца, захоўваючы нацыянальныя традыцыі, у Абердзіне адкрыты шматлікія кафэ і магазінчыкі, якія прапануюць разнастайны выбар страў і прадуктаў, а таксама спадарожных тавараў. У якасці апошніх прапануюцца паштоўкі, кнігі, вырабы рамеснікаў, рэкламная прадукцыя, новыя тавары і каталогі модных магазінаў. Так, у горадзе мы сустрэлі кітайскія лавачкі, інданезійскія і пакістанскія магазіны, а кафе на набярэжнай Абердзіна падзелена на залы па нацыянальных прыкметах і кожнаму можна заказаць сваю любімую страву. У кафэ адпачываюць сем"ямі і кампаніямі. Асабліва любімыя стравы з дароў мора, тым больш, што кожную раніцу ў порце разгорнуты рыбны кірмаш, на якім прадстаўлены ўсе моры свету. Прадукцыю прама з караблёў разбіраюць аптовыя пакупнікі, а што застаецца, паступае на мясцовы кансервавы завод. Да поўдня ў порце няма нават паху рыбы -- усе прыбрана і падрыхтавана да наступнага ранішняга прыёму пакупнікоў.

Наогул трэба адзначыць, што санітарыі, гігіене ў Абердзіне ўдзяляецца асноўная ўвага муніцыпальных службаў. Канешне, сустракаюцца і запушчаныя куткі ў горадзе, але гэта вялікая рэдкасць...

**Э.ЛІЗАРАВА,**
**альт капэлы "Дзянніца".**

## ЯКІМІ БЫЛІ КАНІКУЛЫ?

Мабыць, як ніколі, вельмі напружанай выдалася мінулая зімовая залікова-экзаменацыйная сесія для студэнтаў. Растлумачыць гэта лёгка: напярэдадні стала вядома аб плануемых урадам рэспубліцы зменах у размеркаванні стыпендыяльнага фонду. Грашовая падтрымка з боку дзяржавы карэкціравалася ў залежнасці ад вынікаў вучобы кожнага студэнта. Стала відавочным -- за атрыманыя "двойкі", а потым пераздадзеныя прадметы ў межах устаноўленага тэрміну на станоўчую адзнаку, стыпендыі не бачыць як сваіх вушэй. Да таго ж, і "тройкі" у залікоўцы -- з"ява цяпер непажаданая. Таму і хваляваліся юнакі і дзяўчаты больш, чым раней.

Але цяпер усё гэта ўжо ў мінулым. Зімовыя канікулы кампенсавалі ўсе нярвовыя затраты. Як жа правялі свой адпачынак студэнты нашага універсітэта? Большасць, канешне, ездзіла дадому, дзе набіралася моцы і здароўя, акружаная бацькоўскай увагай і клопатамі. Іншым жа па стану здароўя неабходна было санаторнае лячэнне, у чым ім дапамог студэнцкі прафком. На час канікулаў ім былі куплены пуцёўкі ў санаторыі рэспублікі -- "Буг", "Бярэсце" (Брэсцкая вобласць), "Радон", "Сасновы бор", што пад Мінскам, а таксама ў "Чонкі".

**(Наш кар.)**

## ПА ЎСІХ РАЗДЗЕЛАХ У ТРОЙЦЫ ПРЫЗЁРАЎ

У Міністэрстве адукацыі і навукі Рэспублікі Беларусь падведзены вынікі рэспубліканскіх студэнцкіх гульняў, агляду-конкурсу на лепшую падрыхтоўку спартыўных рэзерваў і спорту вышэйшых дасягненняў сярод ВНУ Беларусі ў 1995 годзе.

У аглядзе-конкурсе сярод факультэтаў фізічнай культуры універсітэтаў і інстытутаў наш факультэт заняў І-е месца.

Па раздзелу спорту вышэйшых дасягненняў на 1-ым месцы акадэмія фізічнай культуры і спорту, на 2-м месцы -- ГДУ імя Ф.Скарыны і на трэцім -- Гродзенскі універсітэт.

У аглядзе-конкурсе на лепшую пастаноўку спартыўна-масавай работы прызавая тройка наступная: акадэмія фізкультуры і спорту, Гродзенскі і Гомельскі універсітэты. БелДУТ -- на 19-м месцы, Мазырскі педінстытут -- на 22-м. Каманды гомельскіх кааператыўнага і медыцынскага інстытутаў у студэнцкай спартакіядзе ўдзел не прымалі.

Адным з лепшых трэнераў названы загадчык кафедры аздараўленчай і лячэбнай фізічнай культуры дацэнт Генадзь Нарскін. Сярод студэнтаў -- першакурснік факультэта фізічнай культуры Сяргей Дуброўскі -- чэмпіён свету 1995 года па кікбоксінгу.

**В.МАРЧАНКА.**

## *Да маладзёжнага фестывалю*

У рамках Міжнароднага маладзёжнага фестывалю "Арт-сесія-96" праводзіцца двухдзённая прэзентацыя мастацкага салона "Век XXI", дзе свае мастацтва прадэманструюць маладыя мастакі і мастакі-мадэльеры.

Аргкамітэт фестывалю аб"яўляе набор студэнтак універсітэта для дэманстрацыі мадэляў адзення. Запрашаюцца дзяўчаты, рост якіх не ніжэй 175 см з аб"ёмамі цела да 46 размеру адзення.

Звяртацца да 25 лютага 1996 года ў культурны цэнтр ГДУ імя Ф.Скарыны. Тэл. для даведак 57-33-30.

**Аргкамітэт фестывалю "Арт-сесія".**

## Усміхніцеся — КУР'ЁЗЫ Ў НАВУЦЫ

Аматараў чытаць дысертацыі знойдзецца не так ужо і шмат, хаця бываюць тэмы, якія могуць выклікаць да гэтых навуковых прац не меншую цікавасць, чым да дэтэктываў. Такім поспехам карысталася ў Іспаніі аб"ёмнае навуковае даследаванне аднаго выкладчыка літаратуры. Аказваецца, патэнцыяльны доктар навук адшукаў каля дзвюх тысяч розных паняццяў на іспанскай мове, якія абазначаюць звычайнае п"янства.

***

Хадзілі чуткі, што адзін дысертант даказваў -- не на жарт! -- у спецыяльнай дысертацыі аб тым, што Расія -- радзіма сланоў, таму што сланы і маманты вядуць свой род ад аднаго агульнага продка, а гэты продак у незапамятныя часы пасвіўся на "прасторах радзімы цудоўнай", а не ў Індыі.

***

Адзін вельмі надакучлівы аспірант давёў свайго кіраўніка да таго, што той сказаў яму: "Ідзіце і распрацуйце пабудову правільнага многавугольніка з 655 537 бакамі." Аспірант пайшоў, каб вярнуцца праз 20 гадоў з адпаведнай пабудовай.

***

Амерыканскі фізік Эвершмен падвёў баланс жыцця сучаснага вучонага да 60-ці гадоў. Дзяцінства і вучоба -- 24 гады, сон -- 20 гадоў, водпуск, выхадныя -- 12 гадоў, харчаванне -- 2,5 гады, іншыя патрэбы -- 1,25 года. Такім чынам, атрымалася лічба 59,75 года. І толькі той час, што застаўся -- 0,25 года, г.зн. 90 дзён за ўсё 60-гадовае жыццё вучоны аддае навуцы.

## ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ імя Ф.СКАРЫНЫ

аб"яўляе конкурс на замяшчэнне вакантнай пасады па кафедры:

-- нямецкай мовы -- выкладчыка.

Тэрмін падачы заяў -- не пазней І месяца з дня апублікавання паведамлення.

Заявы накіроўваць на адрас: 246699 г.Гомель, вул.Савецкая, 104.

**РЭКТАРАТ.**

## Аб'ява — ГЭТА Ў ВАШЫХ ІНТАРЭСАХ

Студэнтам матэматычнага факультэта, якія жывуць на прыватных кватэрах і ў інтэрнатах іншых навучальных устаноў горада, неабходна з"явіцца ў аддзел інтэрнатаў ГДУ да 15 лютага г.г. (галоўны корпус, п. 1-16).

**АДДЗЕЛ ІНТЭРНАТАЎ.**

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат, выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты матэматычнага факультэта выказваюць глыбокае спачуванне загадчыку кафедры алгебры і геаметрыі прафесару **МАНАХАВУ** Віктару Сцяпанавічу з выпадку напаткаўшага яго гора -- заўчаснай смерці **БРАТА.**

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат, выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты біялагічнага факультэта выказваюць спачуванне прафесару кафедры фізіялогіі чалавека і жывёлін **КАЛУГІНУ** Аляксею Савельевічу ў сувязі са смерцю яго **БРАТА.**

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат эканамічнага факультэта, калектыў кафедры эканомікі і кіравання вытворчасцю выказваюць глыбокае спачуванне дацэнту **ТРАЦЭЎСКАЙ** Тамары Дзмітрыеўне з выпадку напаткаўшага яе гора -- смерці **БАЦЬКІ.**

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытый публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.

ЗАСНАВАЛЬНІК -- Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны.

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул, Савецкая, 104, пакой 1-18, тэл. 57-43-21.
Рэгістрацыйны № 221
Спонсары газеты -- НВП "Сучасныя тэхналогіі", прафком студэнтаў.

Газета набрана і звёрстана на настольна-выдавецкім комплексе ІВЦ ГДУ, аддрукавана ў інфармацыйна-вылічальным цэнтры ВА "Беларуснафта".

Рэдактар Ул.П. БАЛОГА

Аб'ём 1 друк. арк.
Тыраж 1500 экз.
Заказ
Падпісана да друку 2.02.96.